сваё слыхавыя ўяўленні і слыхам кантраляваць сваё выкананне. Ён можа ставіць перад сабою высокія мастацкія мэты і адэкватна іх увасабляць. Дзеля гэтага выканаўца ў працэсе самастойных заняткаў павінен развіваць «шматмерны слых», здольнасць рэагаваць не толькі на гукавышынныя змены, але і на дынаміку, тэмбр, рытм, якасць і працяглацсць гучання. Для выхавання ўнутранага слыху найлепшым з'яўляецца вывучванне музычных твораў на памяць без інструмента. Г.Гінзбург зазначыў, што менавіта такім чынам развіваюцца таксама музычнае ўяўленне і выканальніцкая воля. Выканальніцкія рэдакцыі, зробленыя студэнтам без выкарыстання інструмента, дапамагаюць ўдасканальванню гэтых якасцей.Уменне ўнутрана, у думках, агучваць твор дае магчымасць будаваць выканальніцкі план твора, ствараць «ідэальны» гукавы вобраз, да якога трэба імкнуц-ца ў рэальным увасабленні.

На заканчэнне трэба падкрэсліць, што пры ўмовах правільнай арыентацыі заняткаў і дасягненні пастаўленай мэты развіваюцца і замацоўваюцца, як быццам самі па сабе, інтэлектуальныя навыкі, творчы падыход да сваёй дзейнасці.

**Смірнова І.А.,**
**ст.выкладчык**

## ВЫКАНАЛЬНІЦКІ АНАЛІЗ МУЗЫЧНЫХ ТВОРАЎ ЯК СРОДАК АКТЫВІЗАЦЫІ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

У адрозненне ад прасторавых мастацтваў (архітэктуры, дойлідства, жывапісу і г.д.) музыка ёсць мастацтва часавае, якое адлюстроўвае рэчаіснасць у гукавых мастацкіх вобразах. Музычны твор існуе адначасова нібы ў двух вымярэннях: аб'ектыўна -- у выглядзе нотнага запісу, суб'ектыўна -- у час выканання, калі набывае сваё рэальнае гучанне, сваё грамадскае быццё. Гэта асаблівасць музыкі закладзена ў яе прыродзе, у дыялектычным адзінстве музычнага твора і яго выканання.

Праблемы выканальніцкагага майстэрства заўсёды знаходзіліся ў цэнтры ўвагі тэарэтыкаў выканальніцтва і метадыстаў, чые работы былі прысвечаны галоўным чынам вывучэнню асобных аспектаў, якія маюць прамое ці ўскоснае дачыненне да працэсу фарміравання музыкантаў. Што датычыцца методыкі выканальніцкага майс-тэрства, дык яна практычна нераспрацаваная. Далёка не ва ўсіх ВНУ чытаецца спецкурс па тэорыі і гісторыі музычнага выканальніцтва. Няма і спецыяльнай літаратуры па гэтым пытанні. Між тым выканальніцкі аналіз -- неабходны і надзвычай важны этап работы над засваеннем музычнага твора, на якім фарміруецца яго выканальніцкая канцэпцыя і намячаюцца шляхі яе рэалізацыі.

Вывучэнне музычнага твору як мастацкага цэлага мае сваей перадумовай веданне і аналіз цэлага шэрагу пытанняў. Гэта пытанні стылю, музычнай формы, вобразнага зместу, інтэрпрэтацыі, тэхнікі; аналіз гармоніі, поліфаніі, фактуры, аплікатуры і гэтак далей. Адным словам, выканальніцкі аналіз з'яўляецца тым спецыфічным відам дзейнасці, у якім інтэнсіўна ўзаемадзейнічаюць задума і ўвасабленне, дзе неабходна гаварыць пра ўсё: пра тое, што выконваецца, пра выкананне, пра выканаўцу, альбо іншымі словамі, пра эпоху, пра творчасць, пра трактоўку.

Прыступаючы да работы над музычным творам, зручней за ўсё пачаць з аналізу стылёвых з'яў, грамадска-гістарычных умоў эпохі яго стварэння як тыповых вылучальных рысаў творчага мыслення дадзенай эпохі, што праяўляюцца не толькі ў музыцы, але і ва ўсіх іншых відах мастацтва. Ацэнка эпохі ўключае ў сябе вывучэнне грамадскіх працэсаў, ідэй і мастацкіх стыляў перыяду фарміравання светапогляду кампазітара і стварэння данага твора, а таксама нацыянальных адметнасцей, што знайшлі ў ім свой адбітак. Разглядаецца ўзаемасувязь эвалюцыі светапогляду і творчага стылю, кола вобразаў аўтара, асаблівасці яго творчага працэсу, гісторыя стварэння твора і г.д.. Улічваюцца магчымыя адрозненні і інструментарыя мінулай і сучаснай эпох, асаблівасці выканальніцкага стылю, у тым



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліку і аўтарскага, вызначаецца кола выбразаў у кантэксце мастацкага твора.

Прыступаючы да аналізу нотнага тэксту, неабходна падрабязна вывучыць аўтарскія ўказанні, вызначыць жанравыя асаблівасці твора. Пры аналізе музычнай формы трэба звярнуць увагу як на элементы падабенства з традыцыйнымі тыпамі структур, так і на адметныя формаўтвараючыя элементы, у якіх у найбольшай ступені адлюстравана логіка пабудовы формы як працэсу. Неабходна таксама вызначыць сэнсавае значэнне раздзелаў, іх тэмпавыя суадносіны, прааналізаваць танальны і дынамічны план твора. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на рытм і метр твора, улічваючы пры гэтым яго стылевыя асаблівасці. Выразныя магчымасці фактуры трэба разглядаць ва ўзаемасувязі віртуозна-выканальніцкіх і сэнсавых задач. Вялікае значэнне надаецца аналізу штрыхоў, пісьменнаму выбару аплікатуры, а таксама ладагарманічнаму і поліфанічнаму аналізу. Тэмбравая выразнасць, безумоўна, павінна знаходзіцца ва ўзаемадзеянні са стылем і мастацкай задумай твора. Пры аналізе нотнага тэксту ў мэтах фарміравання выканальніцкай канцэпцыі твора і вывучэння розных яго выканальніцкіх інтэрпрэтацый варта азнаёміцца з рознага роду рэдакцыямі і аўдыёзапісамі вывучаемага твора.

Такім чынам, метад выканальніцкага аналізу музычных твораў можна разглядаць як эфектыўны сродак актывізацыі пазнавальнай дзейнасці студэнтаў, бо толькі бесперапынна развіваючыся музычна, інтэлектуальна, артыстычна, можна дасягнуць поспехаў у рабоце над музычным творам.

**Кузьмініч М.Л.,**
дацэнт

## КАНТРОЛЬНЫЯ ЗАДАННІ Ў ДЫЯГНОСТЫЦЫ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ

Працэс музычнага навучання пачынаецца з дыягностыкі музычных здольнасцей, пэўны ўзровень развіцця якіх з'яўляецца важнай умовай падрыхтоўкі будучага музыканта-прафесіянала. Сістэма курсавых экзаменаў, тэхнічных залікаў і акадэмічных канцэртаў -- гэта таксама своеасаблівая дыягностыка ўзроўню развіцця музычных уменняў і навыкаў, якія фарміруюцца на аснове развітых музычных здольнасцей.

Любая дыягностыка вымагае распрацоўкі пэўнай сістэмы параметраў, у адпаведнасці з якімі вымяраецца ступень праяўлення тых ці іншых якасцей спецыяліста. Такімі параметрамі могуць быць: аб'ём засвоенага вучэбнага матэрыялу, тэмп вырашэння кантрольных творчых заданняў, свядомасць дзеянняў пры выкананні творчых заданняў і, нарэшце, узровень сфарміраванасці прафесійнага майстэрства (выканальніцкага, дырыжорскага, інструментатарскага, музыказнаўчага і г.д.).

Можна вылучыць тры ўзроўні сфарміраванасці музычна-прафесійнага майстэрства (умельства): рэпрадуктыўны, эўрыстычны, творчы. Мэта кожнага педагога -- фарміраванне ў сваіх студэнтаў прафесійнага майстэрства на вышэйшым узроўні -- на ўзроўні творчасці (маецца на ўвазе не проста стварэнне новай мастацкай прадукцыі: вынікі вучэбна-творчай дзейнасці студэнтаў павінны адпавядаць пэўным мастацка-эстэтычным крытэрыям). Але гэта немагчыма зрабіць, калі студэнт не прайшоў узровень рэпрадуктыўнага майстэрства (асабліва на этапе першапачатковага музычнага навучання) і эўрыстычны ўзровень (узровень вырашэння тыповых задач ці дзейнасці ў тыповых сітуацыях). Адным са шляхоў свядомага мадэліравання ўзроўню фарміравання прафесійнага майстэрства ў сваіх навучэнцаў з'яўляецца выкарыстанне пэўных метадаў музычнага навучання.

Сярод метадаў музычнага навучання, якія выкарыстоўваюцца на практыцы, педагогі часцей за ўсё называюць наглядныя, практычныя і славесныя (перцэптыўныя), забываючы пра іншыя. Так, гнастычныя метады (метады развіцця мысліцельных працэсаў) -- рэпрадуктыўныя, эўрыстычныя, творчыя --

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ